**Арганізацыя дзейнасці з высокаматываванымі і адоранымі вучнямі па падрыхтоўцы работ даследчага характару**

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры А.У. Філатава

Згодна з псіхалагічнымі даследаваннямі, адоранасць – гэта сукупнасць здольнасцей, якая абумоўлівае паспяховасць дзіцяці ў розных галінах дзейнасці.

Адным з асноўных кірункаў дзейнасці настаўніка з'яўляецца работа з адоранымі вучнямі для напісання работ даследчага характару. Развіццё гэтых здольнасцей, выкарыстанне вынікаў дзейнасці гэтых дзяцей для павышэння ўзроўню выкладання ў цэлым – найважнейшыя задачы ў арганізацыі работы школы.

Сёння педагогу неабходна не толькі навучыцца вучыць школьніка, не толькі фарміраваць загадзя зададзеныя ўласцівасці яго асобы, але і максімальна выявіць, развіць яго індывідуальнасць, дапамагаць асобе пазнаць сябе, самавызначыцца і самарэалізавацца. Дасягненню гэтай мэты садзейнічаюць даследчыя работы па прадметах.

Даследчы рух – гэта частка вялікай і сур'ёзнай работы па развіцці талентаў. Для педагогаў даследванне – гэта эксперымент, у рамках якога адораныя навучэнцы раскрываюць свае веды і , атрымліваць новыя веды. Для навучэнцаў даследванне – гэта магчымасць прадэманстрыраваць наяўнасць уменняў і навыкаў, атрыманых пры падрыхтоўцы, праверцы і параўнанні сваіх магчымасцей.

Дабіцца пэўных вынікаў, на маю думку, можна толькі тады, калі ў ідэальных прапорцыях супадаюць тры асноўныя складальнікі поспеху: адорансць навучэнца, спрыяльныя ўмовы для развіцця яго адоранасці і дастатковая кампетэнтнасць настаўніка.

Настаўнік, які працуе з таленавітымі дзецьмі, павінен будаваць навучанне ў адпаведнасці з вынікамі псіхолага-педагагічнага і прадметнага тэсціравання, умець мадыфікаваць вучэбныя праграмы, стымуляваць вынікі дзейнасці навучэнцаў.

Кожны настаўнік ведае, як цяжка ўлічваць індывідуальныя асаблівасці навучэнцаў, асабліва адораных. На жаль, часта гэтыя дзеці не рэалізуюць свой патэнцыял, ім няўтульна ў межах толькі ўрочнай дзейнасці.

На падрыхтоўчым этапе я прапаноўваю вучням прааналізавць і выбраць праблему ,якая яго цікавіць на дадзеным этапе. Як вядома, самымі трывалымі з'яўляюцца тыя веды, якія чалавек атрымаў самастойна, у выніку пэўных намаганняў.

Асноўную мэту даследчай дзейнасці вучняў я бачу ў тым, каб фарміраваць культуру мыслення, або здольнасць навучэнцаў з патока інфармацыі выдзяляць пэўную інфармацыю, апісваць яе аналітычна і крытычна

ацэньваць, абгрунтавана аналізаваць крыніцы, выкарыстоўваць свае веды і каштоўныя вывады ў новай сітуацыі, аргументціраваць асабістыя погляды.

Падрыхтоўка вучняў да даследавання мае некалькі этапаў.

**І этап – Падрыхтоўчы.**

Ён складаецца з:
1*) Дыягностыкі адораных дзяцей*
- назіранне за дзецьмі на ўроках (адносіны да прадмета, узровень развіцця мовы, актыўнасць мыслення);
- аналіз выканання вучнямі творчых заданняў;
- адсочванне вынікаў удзелу вучняў у розных прадметных конкурсах, алімпіядах, канферэнцыях.
2*) Складанне індывідуальных планаў работы па падрыхтоўцы навучэнцаў..*

*3)Складанне ВМК (вучэбна-метадычнага комплексу)* – вучэбная праграма, сродкі навучання (апорныя канспекты, дыдактычны матэрыял, алімпіядныя заданні мінулых гадоў і г.д.)

**ІІ этап – Рэалізацыя праграмы**.
1*) Фарміраванне матывацыі.*
Сярод выяўленых вучняў заўсёды ёсць такія, у якіх праяўляюцца інтарэсы і здольнасці не толькі да беларускай мовы, таму тут вялікае значэнне мае творчая асоба настаўніка, здольнага зацікавіць вучня сваім прадметам. Настаўнік адкрывае перад вучнем перспектыву, паказвае, як ён будзе развівацца, займаючыся мовай, што яна яму прынясе для яго фарміравання. Далей уся вучэбная дзейнасць мае матывіруючы характар.
2*) Арганізацыя дзейнасці і выбар тэмы для доследу.*

*Тэарэтычны блок.*

Мэта: Паглыбіць і пашырыць веды па асноўных раздзелах школьнага курса , працуючы па прынцыпах гарызантальнага і вертыкальнага ўзбагачэння, іх сістэматызацыя.
Формы работы:
- стымулюючыя і індывідуальныя заняткі;
- самастойная праца;

- праца ў бібліятэцы з літаратурай;

**Падрыхтоўка да комплекснай работы**

1. Пры падрыхтоўцы да комплекснай работы звяртаць увагу не толькі на практычныя навыкі (пісьменнасць, уменне карыстацца пісьмовай літаратурнай мовай, засваенне мовазнаўчага матэрыялу па ўсіх раздзелах курса беларускай мовы), але і навыкі працы са спецыяльнай лінгвістычнай літаратурай, уменне правільна тлумачыць і абагульняць моўныя факты.

2.Уключыць  у  работу з вучнямі канкрэтныя тэмы, якія выклікаюць цяжкасці вучняў на ўсіх этапах даследвання..

## Літаратура


1. **Абабурка, М. В.** Культура беларускай мовы / М.Абабурка. – Мінск: Выш.шк., 1994.
2. **Беларуская мова: Энцыклапедыя** / пад рэд. А.Я.Міхневіча. – Мінск, 1994.
3. **Іўчанкаў, В.І**. Беларуская арфаграфія: Апавяданні і гісторыі / В.І.Іўчанкаў. – Мінск: Пач.шк., 2010, 2011.
4. **Кароткая граматыка беларускай мовы:** у 2 ч. / навук. рэд. А.А.Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. Ч.1.
5. **Кароткая граматыка беларускай мовы:** у 2 ч. / навук. рэд. А.А.Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. Ч.2.
6. **Міхневіч, А.Я.** Слоўка за слоўкам: алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх / А.Я,Міхневіч, Л.П.Кунцэвіч, Ю.У.Назаранка. – Мінск: Выд.цэнтр БДУ, 2006.
7. **Пішам па-беларуску : даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі /** З. І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск : Аверсэв, 2010.
8. **Сямешка, Л.І.** Курс беларускай мовы / Л.І.Сямешка, І.Р.Шкраба, З.І.Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996
9. **Сцяцко, П.** Культура мовы. – Мінск: Тэхналогія, 2002.